2. *Цицерон, М.Т.* О государстве; О законах; О старости; О дружбе; Об обязанностях; Речи; Письма / Марк Туллий Цицерон ; предисл. Е.И. Темнова ; сост., примеч. Е.В. Ляпустина. — М. : Мысль, 1999. — 782 с.

3. *Брагова, А.М.* Цицерон о законах идеального государства / А.М. Брагова // Schole. СХОЛЭ. — 2010. — № 1. — С. 32–41.

4. *Грималь, П.* Цицерон / Пьер Грималь ; вступ. ст. Г.С. Кнабе ; пер. с фр. Г.С. Кнабе, Р.Б. Сашиной. — М. : Молодая гвардия, 1991. — 544 с.

***Д.А. Раманенка, А.І. Макаранка***
*Навуковы кіраўнік — кандыдат гістарычных навук В.М. Лянцэвіч*
*БДЭУ (Мінск)*

# ФАРМІРАВАННЕ СУДОВАЙ СІСТЭМЫ САВЕЦКАГА ТЫПУ Ў БССР

Судовая сістэма дзяржавы — гэта замацаваная ў заканадаўстве сукупнасць дзеючых на яго тэрыторыі судоў, закліканых ажыццяўляць у краіне судовую ўладу [1, с. 57]. Мэта даследавання — правесці аналіз шляху станаўлення і развіцця судовай ўлады, знайсці зведкі аб асаблівасцях фарміравання і функцыянавання судовых інстытутаў у перыяд існавання БССР.

Гісторыя судаўладкавання ў Беларусі цесна звязаная з дзяржаўнасцю і моцна залежала ад заканадаўства РСФСР, асабліва ў першыя гады савецкай улады [2]. Судовыя органы на той час разглядаліся як інструмент абароны рэвалюцыйных заваёў, а развіццё сістэмы праходзіла праз шэраг этапаў.

*Першы этап* пачынаецца з прыняцця СНК РСФСР 24 лістапада 1917 г. Дэкрэта аб судзе № 1, які скасаваў усе «дагэтуль існуючыя агульныя судовыя ўстанаўленні» [далей змяшчаецца пералік відаў судоў], «усе гэтыя ўстанаўленні» замяняюцца «судамі, якія ўтвараюцца на аснове дэмакратычных выбараў» [3, с. 50]. Новая сістэма судовай ўлады на тэрыторыі сучаснай Беларусі ўключала мясцовыя народныя суды і надзвычайныя суды — рэвалюцыйныя трыбуналы [4, с. 3]. 19 снежня 1917 г. з’яўляецца Інструкцыя Наркамата юстыцыі Рэвалюцыйнаму Трыбуналу «Аб Рэвалюцыйным Трыбунале». Ужо ў першыя дні існавання Савецкай дзяржавы ўсведамляецца важнасць злому старога дзяржаўнага апарату і пабудовы новага.

Увосень 1922 г. былі ўтвораны Вышэйшы і Вышэйшы касацыйны суды БССР [5]. Вышэйшы суд меў тры аддзяленні: асаблівай падсуднасці, крымінальнае і грамадзянскае [6, с. 219]. Вышэйшы касацыйны здзяйсняў судовы кантроль за справамі, разгледжанымі ўсімі судовымі органамі [6, с. 219].

Такім чынам, для першага перыяду ў БССР характэрна арганізацыйная раздвоенасць судовай сістэмы, якая ўключала разам з агульнымі і надзвычайныя (выключныя) суды [5].

*Другі этап* гісторыі савецкага суда ў Беларусі ахоплівае 1922–1935 гг. У 1922 г. былі заснаваны пракуратура і адвакатура, праведзена частковая рэформа, у выніку якой сістэма судоў стала трохзвеннай: народныя суды, Вышэйшы суд і Вышэйшы касацыйны суд. Палажэнне аб судаўладкаванні БССР 1931 г. замацавала двухзвёнаcць судовай сістэмы: народныя суды і Вярхоўны Суд.

*Трэці этап* у гісторыі суда ў БССР — гэта 1936–1956 гг. 16 жніўня 1938 г. быў прыняты Закон «Аб судаводстве СССР, саюзных і аўтаномных рэспублік», у адпаведнасці з якім у БССР дзейнічалі тры звёны судоў: народныя; абласныя; Вярхоўны Суд БССР [5]. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР 14 жніўня 1954 г. выдаў Указ «Аб утварэнні Прэзідыумаў у складзе Вярхоўных Судоў саюзных і аўтаномных рэспублік, краявых, абласных судоў і судоў аўтаномных абласцей». XX з'езд КПСС (1956 г.) прызнаў неабходным дэмакратызаваць дзяржаўнае кіраванне і пашырыць правы рэспубліканскіх і мясцовых органаў у сацыяльна-палітычнай сферы. Вярхоўны Савет СССР 11 лютага 1957 г. прыняў Закон «Аб аднясенні да вядзення саюзных рэспублік заканадаўства аб уладкаванні судоў саюзных рэспублік…» [2, с. 6–7].

*Чацвёрты этап* гісторыі развіцця суда ў БССР — 1957–1976 гг. У адпаведнасці з вышэйзгаданым Законам ад 11 лютага 1957 г. былі прыняты Асновы заканадаўства аб судаўладкаванні Саюза ССР, саюзных і аўтаномных рэспублік і Палажэнне аб ваенных трыбуналах ад 25 снежня 1958 г. Вярхоўны Савет БССР 20 лістапада 1959 г. прыняў Закон аб судаўладкаванні БССР. Вышэйшы судовы орган СССР, узначальваючы па-ранейшаму ўсю сістэму судоў, стаў пераглядаць ў парадку нагляду рашэнні, прысуды і пастановы Вярхоўных Судоў саюзных рэспублік, калі яны супярэчылі агульнасаюзнаму заканадаўству або парушалі інтарэсы іншых саюзных рэспублік [5].

*Пяты этап:* 1976–1986 гг. Законам СССР ад 25 чэрвеня 1980 г. Вярхоўны Савет СССР зацвердзіў новую рэдакцыю Асноў заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік аб судаўладкаванні і Палажэнне аб ваенных трыбуналах. Судовую сістэму БССР складалі Вярхоўны Суд, абласныя суды, Мінскі гарадскі суд і раённыя (гарадскія) народныя суды [7, с. 115].

*Шосты этап* (1986–1991 гг.) звязаны з дэмакратызацыяй і галоснасцю, правядзеннем у краіне прававой рэформы, і як вынік — з павышэннем ролі суда, умацаваннем гарантый судаводства [5].

Даследаванне паказвае, што судовая сістэма БССР фарміравалася ў цеснай сувязі з палітычнымі і прававымі пераўтварэннямі ў СССР. Пачынаючы з 1917 г. яна прайшла шэсць этапаў развіцця: ад стварэння рэвалюцыйных трыбуналаў і мясцовых народных судоў да ўсталявання стабільнай трохзвёнай структуры з выразна акрэсленымі паўнамоцтвамі. Асабліваe значэнне мелі рэформы 1922, 1931, 1938, 1959 і 1980 гг., якія адлюстроўвалі эвалюцыю судаўладкавання і адаптацыю яго да змяненняў у дзяржаўным курсе. Увесь перыяд вызначаўся спалучэннем цэнтралізаванага ўплыву агульнасаюзнага заканадаўства і спробай умацавання ролі нацыянальных судовых інстытутаў.

**К р ы н і ц ы**

1. *Глухова, О.В.* Судоустройство : учеб.-метод. комплекс / О.В. Глухова. — Брест : БрГУ им. А.С. Пушкина, 2019. — 437 с.

2. *Бибило, В.Н.* Становление и развитие белорусского законодательства о судоустройстве / В.Н. Бибило // Право и демократия : сб. науч. тр. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: В.Н. Бибило (гл. ред.) [и др.]. — Минск, 2010. — Вып. 21. — 291 с. — URL: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/15265/1/14_бибило.pdf (дата обращения: 13.03.2025).

3. Декрет о суде // Республиковано в № 17 Газеты Временного Рабочего и Крестьянского Правительства от 24 ноября 1917 года. — С. 50–69.

4. *Адамюк, О.И.* Создание первых органов военной юстиции на территории Беларуси в составе РСФСР (1917–1918 гг.) / О.И. Адамюк // Вестник Академии МВД Республики Беларусь. — 2009. — № 1 (17). — С. 3–6.

5. *Точкар, О.А.* Развитие судебной власти в Беларуси в XX столетии / О.А. Точкар // Электронная библиотека БГУ. — URL: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/27505/1/Точкар_Развитие%20судебной%20власти.pdf (дата обращения: 09.04.2025).

6. *Вішнеўскі, А.Ф.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапаможнік / А.Ф. Вішнеўскі. — Мінск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. — 319 с.

7. *Кочурко, Ю.В.* Становление и развитие судебной власти на территории Беларуси: исторический и правовой аспекты / Ю.В. Кочурко // Вести Национальной Академии наук Беларуси. — 2017. — № 1. — С. 113–118.

***Е.И. Романчик***
*Научный руководитель — кандидат юрид. наук Н.О. Рамазанова*
*БГЭУ (Минск)*

# НЕКОТОРЫЕ ПРАВОВЫЕ АСПЕКТЫ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПРОКУРОРА В АДМИНИСТРАТИВНОМ ПРОЦЕССЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Прокуратура — особый государственный орган, признанный осуществлять надзор за исполнением действующего законодательства на территории Республики Беларусь.

Полномочия прокурора в рамках Процессуально-исполнительного кодекса Республики Беларусь об административных правонарушениях можно условно разделить на три основные группы:

1. Полномочия по выявлению нарушений законодательства Республики Беларусь, их причин и условий.

2. Полномочия, направленные на устранение выявленных нарушений законодательства Республики Беларусь, их причин и условий.

3. Полномочия по административному преследованию правонарушителей.